**ПРАЎДА Мастоўская**

№ 20 (67) 30 лістапада 2008 года

**Калі вы жадаеце атрымліваць** у далейшым наша выданне, калі ласка, дашліце sms з паведамленнем адраса, на які павінна прыходзіць **«Мастоўская праўда»** на нумар : **+ 48 725 302378**

# Што Еўразвяз можа даць Мастоўшчыне



**16 лістапада, актывісты Мастоўскага Руху "За Свабоду" распаўсюдзілі ў горадзе Масты, а таксама вёсках Лунна, Дубна, Мікелеўшчына, Масты Правыя і Масты Левыя 400 асобнікаў брашуры "Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі". Такім чынам актывісты Руху "За Свабоду" далі магчымасьць жыхарам Мастоўскага раёна падрабязна даведацца пра магчымсьці супрацоўніцтва Еўрасаюза і Беларусі.**

Па словах рэгіянальнага каардынатара Руху "За Свабоду" у Гарадзенскай вобласьці Аляксандра Зарэмбюка, акцыя была арганізавана з мэтай пашырэньня інфармацыі пра 12 прапановаў Еўрапейскага Саюзу беларускаму народу і яе ўраду. А таксама з мэтай прапаганды ідэі Еўрапейскай інтэграцыі Беларусі, еўрапейскіх каштоўнасцяў і еўрапейскага ўзроўню жыцця, які мы зможам дасягнуць пры ўступленні нашай краіны ў Еўрапейскі Саюз.

Мастаўчане і жыхары населенных пунктаў Мастоўскага раёна прыязна ставіліся да распаўсюду такога роду брашуры і выказвалі актывістам Руху "За Свабоду" словы падтрымкі і пажаданьні найхутчэйшай інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі Саюз.

**Віктар Сахарэўскі**

## АПЫТАННЕ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ САЙТА masty.belarda.org

Ці падтрымліваеце вы сбор подпісаў за зьмену беларускага выбарчага заканадаўства?




- Я не бачу ў гэтым сэнсу – **28.6%**
- Мне усё роўна, я не ўдзельнічаю ў ніякіх выбарах – **4.8%**
- Так, бо выбары ў нас несправядлівыя – **61.9%**
- А навошта? У нас дэмакратычнае выбарчае заканадаўства – **4.7%**

# Рух "За Свабоду" падаў дакументы на рэгістрацыю

Заява на рэгістрацыю ПАГА "Рух "За Свабоду" і усе неабходныя дадатковыя дакументы чацверты раз перададзены ў Міністэрства юстыцыі.

У заяве гаворыцца, што асноўнай мэтай Праваабарончa-асветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду" з'яўляецца абарона правоў і свабод чалавека, якія зафіксаваныя ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў міжнародных дакументах па правах чалавека, а таксама асвета грамадзян у гэтай сферы.

Рашэнне аб стварэнні Праваабарончa-асветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду" прынятае на Устаноўчай канферэнцыі, якая адбылася 23 кастрычніка. У канферэнцыі удзельнічалі больш за 70 прадстаўнікоў з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Гэта ўжо чацвёртая спроба Руху "За Свабоду" легалізаваць сваю дзейнасць. Дакументы на рэгістрацыю падаваліся сёлета 10 сакавіка, 21 ліпеня і 12 верасня 2007, Ва усіх папярэдніх выпадках Мінюст адмаўляў у рэгістрацыі па розных надуманых прычынах. Абскарджванні рашэнняў Мінюста у судзе плёну не далі.

# Мастаўчанін заявіў аб крадзяжы машыны, каб не плаціць штраф

**Жыхар Мастоў, добра выпіўшы, вырашыў пракаціцца на сваім аўтамабілі па акрузе. І апынуўся ў дзевяноста кіламетрах ад хаты, у Свіслачы. Тамака на стромкім павароце ён урэзаўся ў бетонавы плот і знёс яго.**

Дадому дабраўся на папутках, лёг спаць, а раніцой адправіўся ў міліцыю з заявай аб крадзяжы машыны. Мужчына разлічваў: калі аўтамабіль лічыцца скрадзеным, усё парушэнні аўтаматычна спішуць на злачынца.

Злавілі мужчыну на дробязях: калі сталі распытваць падрабязнасці, той заблытаўся ў дэталях і прызнаўся, растлумачыў начальнік следчага аддзела Мастоўскага РАЎС Анатоль Верабей. На мастаўчаніна завялі крымінальнае справу. За тое, што ён здзейсніў ДТЗ і пакінуў месца аварыі, прыйдзецца заплаціць штраф - мільён рублёў.

**Надзея Завіноўская, Вячэрні Гродна**

# Абласны сход па стварэнні новай партыі

**22 лістапада ў Мастах прайшоў першы абласны сход аргкамітэта па стварэнню партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" у Гарадзенскай вобласці.**

На сходзе прысутнічалі дэлегаты з Гародні, Ліды, Мастоў, Карэлічаў і Слоніма.З рэспубліканскага кіраўніцтва, Масты наведаў адказны сакратар БХД Дзяніс Садоўскі.

Сход пачаўся з агульнай малітвы "Ойча наш". Далей былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі да маючага адбыцца ў сакавіку 2009 года устаноўчага з'езду партыі. Дэлегаты падвялі вынікі дзейнасці БХД у Гарадзенскай вобласці, абмеркавалі хаду кампаніяў "За сямейныя каштоўнасці", "Супраць алкагалізму і абортаў" і дамовіліся абдалейшай каардынацыі дзеянняў арганізацыйнага камітэту БХД. Прысутныя таксама вырашылі больш актыўна весці працу па далучэнні ў шэрагі партыі новых сяброў.

**http://masty.belarda.org**




# Новыя правілы ўвозу цыгарэт і алкаголя ў Польшчу

**З 1 снежня 2008 года ўводзяцца новыя правілы ўвозу на тэрыторыю Польшчы тытунёвых і аалкагольных вырабаў. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Мытнай службе Польшчы.**

Згодна новай пастанове грамадзяне, якія ўязджаюць у Польшчу з краін, якія не з'яўляюцца членамі Еўрасаюза, маюць права правезці за адзін раз 2 пачкі цыгарэт. На сённяшні дзень ліміт складае 10 пачак.

Жыхары непамежнай зоны за адзін раз змогуць увезці ў Польшчу 1 л алкоголю болей 22% моцы, 2 л алкагольных напояў меней 22% моцы, 4 л віна альбо 16 л піва. У сваю чаргу жыхары памежнай зоны змогуць увезці 0,5 л алкаголю моцней за 22%, а таксама 0,5 л алкагольнага напою не мацней за 22%.

**БЕЛТА**

## АДНЫМ СКАЗАМ

У Беларусі ў студзені - кастрычніку 2008 года сальда знешней таргоўлі таварамі склалася адмоўным у памеры 4747,6 млн. USD, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналіза. За кастрычнік 2008 года адмоўнае сальда павялічылася на 600 млн. USD. У студзені-кастрычніку 2007 года адмоўнае сальда склала 3228,9 млн. USD.

Прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі накіраваў ліст старшыні Еўракамісіі Жазе Мануэлю Барозу, у якім сцвярджае, што Расія не выконвае план Мядзведзева-Саркaзі і заклікае Еўрапейскую Камісію прааналізаваць сітуацыю ў Грузіі.

Гадавое заданне па будаўніцтве жылля ў Мастоўскім раёне перавыканана. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч.

Па яго словах, у студзені-кастрычніку бягучага года ў рэгіёне пабудавана 186 кватэр, у тым ліку ў райцэнтры - два 60-кватэрных дамы. Перавыканана і гадавое заданне па будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў. У сельскай мясцовасці за гэты год уведзена 44 дамы сядзібнага тыпу. Яны, як правіла, будуюцца ў аграмястэчках, адзначыў Аляксей Шафарэвіч.

Жыхары дамоў па вул. Будаўнікоў дамагліся пераразліку аплаты за ацяпленне і гарачую ваду за перыяд, калі ў іх дамах не працаваў лічыльнік цяпла з дапамогай калектыўнага звароту на імя старшыні Мастоўскага райвыканкама.

# Белорусы скупают валюту

**Чистый спрос (спрос за вычетом предложения) населения Беларуси на инвалюту в ноябре 2008 года составит не менее $300 млн против $100 млн в октябре. С конца октября и в течение ноября среднедневной чистый спрос на доллары со стороны физлиц превышает $15 млн. Об этом сообщил "Interfax.by" источник в госорганах со ссылкой на данные Нацбанка.**

До октября в стране наблюдалась обратная тенденция: население выступало чистым продавцом инвалюты. За 9 месяцев 2008 года чистая продажа инвалюты физлицами составила $754,8 млн против чистого спроса на $326,3 млн за аналогичный период 2007 года.

«Нацбанк, как и ранее, не намерен вводить какие-либо ограничения на валютном рынке для физлиц, хотя такие предложения уже звучали», - подчеркнул источник.

Он также заявил о продолжающемся росте спроса на инвалюту со стороны юрлиц. «Сейчас присутствует явная тенденция вывода валюты из Беларуси под любым предлогом. Это объясняется намерением такого рода игроков впоследствии заработать на спекулятивных сделках в расчете на девальвацию или «черный» рынок», - считает источник.

В Беларуси в январе-сентябре 2009 года в результате сделок во всех сегментах валютного рынка чистый спрос на инвалюту составил $1 млрд 47,9 млн, что в 11,5 раза больше по сравнению с аналогичным периодом 2007 года.

**Агенство финансовых новостей**



# Стралкі вышлі на сцежку вайны

**Гэты сезон палявання на кабана шматлікімі жыхарамі Беларусі вітаецца: зашмат жывёлы і нерваў пакалашмацілі, і шкоды нанеслі сельгасугоддзям.**

Аб тым, наколькі пасмялелі кабаны ў апошні час, можна судзіць па тым, што ў Мастах яны ледзь не зашлі ў гарадскую краму. Ну, а набегі на палі былі часам настолькі нахабнымі, што не дапамагалі ні вартаўнікі, ні розныя адпалохваючыя мерапрыемствы. Таму загоннае паляванне, якое будзе працягвацца да 15 снежня, павінна спрыяць памяншэнню папуляцыі гэтай жывёлы.

**Паводле: Алесь Васількоў, www.bulletinonline.org**

# Мастоўскія кандытары заваявалі 5 медаляў

Кандытары з ЧУП "Коаппром" Мастоўскага райпо заваявалі 5 срэбных медаляў на рэспубліканскім аглядзе якасці кандытарскіх вырабаў "Ласунак-2008", які праходзіў у рамках 4-ай Міжнароднай спецыялізаванай выставы "Хлебная і кандытарская справа". Медалі былі атрыманыя за рулет "Баярскі", кекс "Мастоўскі" і мучныя ласункі "Грыбы", "Вожыкі", "Ласуха з макам".

**Аляксандр Юрэвіч**

*Рэдакцыя "Мастоўскай Праўды" віншуе нашых кандытараў з цудоўнай адзнакай іх прафесіяналізму і жадае ім новых посьпехаў і дасягненняў.*




# Кампанія «За Еўрапейскую Мастоўшчыну»

**24 лістапада ў Мастах распачалася грамадска-інфармацыйная кампанія "За Еўрапейскую Мастоўшчыну", ініцыятарамі якой выступаюць мясцовыя актывісты руха "За Свабоду" і прадстаўнікамі няўўрадавых арганізацый і ініцыятываў раёнаў.**




Грамадскія актывісты распаўсюдзілі ў Мастоўскім раёне ўлёткі і расклеілі плякаты з інфармацыяй аб кампаніі і кантактамі, паводле якіх людзі могуць звярнуцца са сваімі прапановаміі пытаннямі. Удзельнікі інфармацыйнай кампаніі "За Еўрапейскую Мастоўшчыну" плануюць прапагандаваць ідэі інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі саюз і папулярызаваць еўрапейскія каштоўнасці сярод жыхароў раёна.

На думку каардынатара кампаніі Алеся Зарэмбюка набліжанасць Мастоўскага раёна да еўрапейскіх межаў сведчыць перш за ўсё аб зацікаўленасці жыхароў рэгёна сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі магчымасцямі супрацоўніцтва з суседзямі.

Грамадскія актывісты ў сваёй дзейнасці плануюць займацца вырашэньнем праблемаў раёна і кансультацыямі жыхароў Мастоўшчыны па шырокаму спектру грамадска значымых пытанняў, спрыяць развіццю мясцовага і рэгіянальнага самакіравання , а таксама дапамагаць жыхарам Мастоўшчыны ў абароне іх законных правоў і інтарэсаў.

Інфармацыйны партнёр кампаніі: "Масты: рэгіянальны партал".

**Ул.інф.**

# БДІПЧ АБСЭ: Нягледзячы на некаторыя паляпшэньні, выбары ў Беларусі не адпавядалі стандартам АБСЭ

**Нягледзячы на "некаторыя паляпшэнні", выбары ў Беларусі не адпавядалі стандартам АБСЕ, гаворыцца ў выніковым дакладзе Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ па ацэнцы мінулых парламенцкіх выбараў.**

Дакумент апублікаваны на афіцыйным сайце БДІПЧ АБСЕ.

Нагадаем, падчас парламенцкіх выбараў у Беларусі, якія адбыліся 28 верасня, было выбрана 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Ніводзін з прадстаўнікоў апазіцыі ў новы склад ніжняй палаты парламента не прайшоў.

"Неабходны далейшыя сур'ёзныя намаганні, калі Беларусь шчыра жадае правесці сумленныя дэмакратычныя выбары ў адпаведнасці з яе абавязацельствамі ў АБСЕ", — падкрэсліваецца ў дакладзе.

У прыватнасці, лічаць прадстаўнікі БДІПЧ АБСЕ, выбарчае заканадаўства Беларусі не дае магчымасці для "сапраўднай палітычнай канкурэнцыі і роўнага стаўлення да кандыдатаў з боку ўладаў".

У той жа час, зазначаюць эксперты, на гэтых выбарах было "значна палепшана" супрацоўніцтва беларускіх уладаў з членамі місіі БДІПЧ АБСЕ.

"Гэта магло б стаць асновай для блізкага дыялогу пасля выбараў, каб абмеркаваць выкананне найважнейшых стандартаў АБСЕ,

якія могуць істотна садзейнічаць набліжэнню выбарчага працэсу ў Беларусі да стандартаў АБСЕ", — зазначаецца ў дакладзе.

У якасці прыкладу "пазітыўных крокаў", якія былі зроблены ўладамі Беларусі напярэдадні парламенцкіх выбараў, у справаздачы прыводзіцца ўключэнне ў некаторыя выбарчыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыі, паўтор пяціхвілінных передвыбарных ролікаў кандыдатаў па тэлебачанні і радыё, а таксама рэкамендацыя Цэнтрвыбаркама "запячатваць на ноч скрыні з бюлетэнямі на перыяд датэрміновага галасавання".

Аднак, падкрэсліваюць эксперты, беларускае заканадаўства паранейшаму "перашкаджае правядзенню выбараў" у адпаведнасці з дэмакратычнымі стандартамі.

Эксперты зазначаюць, што Выбарчы кодэкс Беларусі "не забяспечвае празрыстага механізму захаванасці скрынь з бюлетэнямі пасля пачатку датэрміновага галасавання, а таксама механізму абароны самога бюлетэня".

У дакладзе гаворыцца, што палітычныя партыі адыгрывалі "нязначную ролю" на выбарах.

"Стратэгіяй большасці кандыдатаў было пазіцыянаванне сябе як беспартыйных, асабліва сярод прадстаўнікоў апазіцыі, каб павялічыць шансы на рэгістрацыю", — зазначаецца ў дакладзе.

Большасць апазіцыйных кандыдатаў мелі магчымасць зарэгістравацца і "ніякія кандыдаты не былі выкраслены са спіса", але многім было адмоўлена ў рэгістрацыі "з-за нязначных парушэнняў фармальных патрабаванняў", падкрэсліваецца ў дакладзе.

Акрамя таго, абмежаванні з боку дзяржаўных органаў у мэтах стварэння фармальнай роўнасці паміж усімі кандыдатамі прывялі да "мінімуму месцаў для сустрэч, фінансавання кампаніі і доступу да СМІ".

На думку экспертаў місіі, усё гэта "стварае магчымасці для фальсіфікацый".

**БелаПАН**

**МАСТОЎСКАЯ ПРАЎДА**
Грамадска-інфармацыйнае выданне Мастоўшчыны
№ 20 (67) 30 лістапада 2008 г.
**Заснавальнік: Аляксандр ЗАРЭМБЮК.**
***Дэпутат Мастоускага райсавета 24 - га склікання***
Надрукавана на фінасавыя ахвяраванні жыхароў г. Масты ў друкарні ААТ Бліц-Прынт, г. Кіеў вул. Даўжэнка, 9.
Выходзіць 2 разы ў месяц.
**Распаўсюджваецца бясплатна.**
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць інфармацыі. Іх меркаванне можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.